Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

СЬЦЯГ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 7 — Вільня, Серада 25-га ліпня 1928 г. — Год 1

За лепшую плату і людзкія варункі працы.

Пара цяжкіх летніх прац на вёсцы ўжо стаіць на першым месьце дзеннага парадку: сяляне ўжо косяць, жніво набліжаецца.

Доўгі летні дзень, пад нязносна пякучымі касулямі сонца касец і жняя працуюць да апошняй кроплі поту, да крывавых мазалёў.

Большасьць працоўных у нас, на Зах. Беларусі, *не сабе* часта косяць і жнуць, не карыстаюцца, як належала-б усім людзям, з сваёй працы. Беззямельныя і малазямельныя, старыя і малыя *ідуць наймацца* да кулака ці да абшарніка, каб хоць „абгрызенай косьцю" адагнаць на хвіліну голад, які ад вякоў гняце іх навалай.

Варункі, на якіх ім прыходзіцца наймацца, хіба горшыя, як дзе. Плата, якую даюць найміты, зводзіцца, дзякуючы таму, што шмат ёсьць рабочых сіл у беззямельнай весцы, да мінімуму г. зн. да найменьшай, — па некалькі залатовак у дзень. Працаваць за гэту плату трэба, як кажуць, ад цямна да цямна, найменьш то 12 гадзін дзенна, без належнага адпачынку, на кіслым малацэ, прытым ужываюцца выперадкі, кіруючыся прынцыпам: хто больш зробіць—больш дастане. Гэты спосаб хіба найбольш практыкуецца наймітамі вёскі і места, які галоўным чынам б'е па *масе рабочых*, бо заўсёды толькі *адзінкі* ёсьць мацнейшыя, і даводзіць гэтую масу да найбольшага *змучаньня*.

Усё гэта кажа нам аб тым, што *працоўныя, якія ідуць наймацца, павінны паклапаціцца аб большай плаце за сваю працу і аб лепшых варунках гэтай працы.*

Якім-жа чынам зрэалізаваць гэтую думку?

У ходзе барацьбы з капіталам, працоўны народ, між іншымі арганізацыямі, як палітычныя і каапэратыўныя, стварыў прафэсіянальныя саюзы. Заданьнем прафсаюзу ёсьць аб'яднаньне работнікаў аднае прафэсіі, каб гэтым вясьці эканамічную барацьбу. Гэтак у гарадох ёсьць саюзы будаўляныя, мэталёўцаў, мясьнікоў, шаўцоў і г. д. Усё яны пры помачы дружных штрайкаў змушаюць капіталістаў даць лепшую плату, скараціць рабочы дзень, застрахавацца ад выпадкаў; у сваёй арганізацыі яны маюць газэты, кніжкі, ладзяць спэктаклі, лекцыі.

Дык вось, трэба, каб *пры большых ці меньшых дварох парабкі, малазямельнікі і беззямельнікі, якія ідуць у наймы, арганізаваліся ў свае прафэсіянальныя саюзы, у саюзы парабкоў і пры помачы сваёй арганізацыі дамагаліся большай платы, і лепшых чалавечых варункаў працы:* 8-мігадзінны рабочы дзень, проці спосабу на выперадкі.

У некаторых дварох існуюць такія саюзы, але яны нічога не працуюць, але служаць толькі для *кампраміттацыі ўсякай арганізаванай барацьбы*, адбіваюць ахвоту да яе, бо *кіруюць імі здрадніцкія пэпээсы*. Тут заданьне будзе ў тым, каб *вырваць кіраўніцтва з рук гэтых угадоўцаў і паставіць арганізацыю, як сьлед, здольную да барацьбы за лепшы быт сваіх сяброў*—наемных рабочых.

Трэба памятаць, *што толькі праз сваю арганізацыю працоўныя могуць дабіцца лепшай будучыні.*

Да Акружных Управаў і Гурткоў Таварыства Беларускае Школы.

Набліжаецца новы школьны год. Расьце трывога бацькоў за сваіх дзяцей, якім пара йсьці ў школу. Вучэньне вымагае грошаў, і не малых грошаў. А дзе іх узяць нашаму гаротнаму селяніну. Вось так і марнуюцца дзеці, часта вельмі здольныя да навукі. Ці грамадзянства нашае можа спакойна праходзіць міма гэтае балючае справы нашага жыцьця. Ці не сьвяты абавязак Гурткоў і Акружных Управаў Т-ва Беларускае Школы заапекавацца такімі дзяцьмі, каб даць ім магчымасьць атрымаць асьвету ў роднай гімназіі, на роднай мове, інакш скуль-жа ў нас будуць асьвечаныя, культурныя працаўнікі і змагары на шляху адраджэньня. Гэтая справа абгаварвалася на гадавым зьезьдзе Т-ва Беларускае Школы ў сьнежні 1927 г. і тады было пастаноўлена: зьвярнуцца з заклікам да Акружных Управаў і Гурткоў Т-ва Беларускае Школы, каб закладалі стыпэндыі для сваіх кандыдатаў—вучняў беларускіх гімназіяў, зьбіралі ахвяры і складкі, ставілі спэктаклі, лекцыі на карысьць незаможных вучняў і т. д., каб памагчы найбольш здольным з вясковае беднаты атрымаць асьвету.

Аб гэтай пастанове Галоўная Управа лічыць на часе напомніць і Акружным Управам, Гурткам і ўсім, каму дарагая родная асьвета, культура і шчасьце нашае Бацькаўшчыны.

Галоўная Управа.

„Пацыфістычная акцыя „Новай Нямеччыны" распачынаецца...

Новы нямецкі ўрад, як мы ведаем, высунуў цэлую праграму дамаганьняў міжнароднага характару, на чале якіх стаіць—побач з скасаваньнем акупацыі — і перагляд некаторых граніцаў. „Нямецкі ўрад, казаў канцлер Мюллер, выракаючыся катэгарычна думкі аб аружным захопе адабраных ад яе зямель, будзе імкнуцца вырашыць пастаўленыя яму гісторыяй задачы—чыста і выключна мірнымі спосабамі"...

Але нямецкая прэса, можа, і не бяз слушнасьці заяўляе на гэта, што амаль ня ўся гэта „пацыфістычная праграма" нямецкага ўраду ў галіне міжнародавай палітыкі — такога зьместу, што няўхільна можа выклікаць вайну—пры першай-жа спробе зрэалізаваньня гэтай праграмы...

Польская прэса асабліва занепакоена быццам распачатай ужо падрыхтоўкай рэалізацыі аднаго з скрытых пунктаў праграмы новага нямецкага ўраду—скасаваньня „Гданскага Калідору".

Вось—жменя фактаў, паданых у польскай прэсе.

I. Зьезды нямецкіх „крэсоўцаў".

У Бэрліне адбыўся толькі-што кангрэс дзеячоў з Усходняй і Заходняй Прусіі. Кангрэс прыняў рэзалюцыю, трэбуючую ад новага ўраду скасаваньня „польскага калідору" і злучэньня Усходняй Прусіі з Нямеччынай.

У другім месьце Прусіі адбыўся зьезд ведамага „Ост-марк-фэррэйну" (Таварыства Абароны Усходняй Прусіі), які прыняў пастанову — аб далейшай працы дзеля адабраньня назад страчаных нямецкіх тэрыторыяў. Рэзалюцыя пратэстуе проці палянізацыі Данцыга.

Рэзалюцыя заклікае прэзыдэнта Гіндэнбурга, каб той пільнаваў, каб Польшча точна спаўняла свае абавязкі адносна да немцаў-грамадзян Польшчы, дый каб гандаль места Данцыга не цярпеў стратаў з прычыны разбудовы польскіх партоў на Паморры.

2. Мірнае заваяваньне польскага Паморра нямецкім капіталам.

Польская прэса, асабліва пазнанская ды паморская, страшэнна занепакоена гэтым узмогшымся рухам проціпольскім у Прусіі.

„Проціпольская прапаганда, пішуць польскія газэты, якую разьвіваюць у апошнія часы немцы, прымае непакоючы характэр „іррэдэнты", — гэта значыць агітацыі за зварот адабраных у выніку вайны зямель.

У Паморры немцы распачалі запраўдную „канцэнтрацыйную атаку". Нядаўна ў Польшчы выклікала перапалох вестка аб тым, што немцы—праз гданскія ды галяндзкія банкі кінулі 150 мільёнаў злотых на пазыкі для сваіх землякоў на польскім Паморры. Пазыкі гэтыя — на надзвычай выгадных варунках, амаль не беспрацэнтавыя—атрымліваюць ня толькі земляробы на палепшаньне ды пашырэньне сваіх шматоў зямлі, але таксама і дамаўласьнікі, прамыслоўцы, купцы і дробныя рамесьнікі.

Якую мэту маюць нямецкія ўлады, кідаючыя сотні мільёнаў на польскі калідор, аддзяляючы масы ў нямецкай рэспубліцы ад Усходняй Прусіі, гэта—ясна.

Паморра мае быць апанавана нямецкім капіталам, нямецкі стан валаданьня ў гэтым адабраным на карысьць Польшчы краі мае быць павялічаны за ўсялякую цану: зямля, дамы, прамысловыя заклады пад націскам нямецкага капіталу пачнуць шпарка пераходзіць з польскіх рук у нямецкія, каб прыдаць краю больш нямецкі характар. Гэта-ж— „гаспадарчыя падставы для палітычнай акцыі, якую мае хутка распачаць — па ўсяму фронту нямецкая палітыка. Польская прэса б'е запраўдную трывогу, крычучы—аб набліжыўшайся ўжо небясьпецы.

Падчырківае польская прэса і асаблівую небясьпеку нямецкага каапэратыўнага руху ў „польскім калідоры" — асабліва сярод сялянства. 157 каапэратываў, дасканала арганізаваных, маючых вялікія капіталы, шмат дробных, раскіданых па краю „людовых банчкаў"—ахапілі фінансава і гаспадарча ўвесь край, „пільнуючы, каб ні шматку зямлі не пераходзіла ў польскія рукі...

Наагул нямецкія каапэратыўныя арганізацыі на гэтых „чыста польскіх абшарах" заходніх „крэсаў" Польшчы маюць, як сьцьвярджаюць польскія газэты, 682 каапэратываў — з 50-мільёнавым абаротам і 50.000 сяброў. Самі польскія крэсавыя газэты прызнаюць, што польскі „Саюз Заробкавых Каапэратываў" на абшары ўсей Заходняй Польшчы ня мае такіх лічбаў".

Нямецкая меншасьць тутака, кажуць газэты, лепш арганізавана, мае вялікшыя капіталы, — таму, што немцы атрымліваюць вялізарныя сумы з заграніцы.

3. „Ваенныя падрыхтаваньні".

Побач з націскам на дыплёматыю з боку „голасу народу" і з фінансава-гаспадарчым заваяваньнем краю ізноў нямецкім капіталам—польская прэса б'е трывогу з прычыны ўжо быццам распачатых навет... ваенных падрыхтаваньнях у-ва Усходняй Прусіі на польскім пагранічны.

Вось жменя „інфармацыяў", падаваных польскімі газэтамі. Насколькі яны—праўдзівыя, ня ведама.

„Рэйхсвер" (так завецца цяпер нямецкая армія, забароненая Трактатам) зрабіў у апошнія дні вельмі важныя перагрупіроўкі войскаў у Прусіі, павялічыўшы значна ваенныя гарнізоны ў важнейшых стратэгічных пунктах краю — пабліз польскай граніцы. „Няма сумляваньня, што гэтыя перамяшчэньні войскаў маюць цесную сувязь з апэрацыйнымі мяркаваньнямі".

Значныя кавалерыйскія сілы разьмешчаны ў такіх пунктах, з якіх павінны будуць распачацца якраз камбінаваныя атакі кавалерыі і паветранага флёту на польскія прыгранічныя стратэгічныя пункты. Таксама пачынаецца ўсіленьне гарнізону пяхоты ў Мальбургу, які быццам мае на мэце ў патрэбны мамэнт апэрацыю проці мосту на Віське пад Тчэвам.

Польская прэса падчырківае ў зьвязку з тым той галас, які падняла нямецкая прэса—з прычыны збурэньня польскай уладай мосту на Віське пад Сьментавым. Трэба думаць аднак-жа, што і гэта збурэньне зроблена—па стратэгічным меркаваньням.

Арганізуйце камітэты самапомачы.

Ізноў, як і ў мінулым годзе, на абшары ўсей амаль Зах. Беларусі пранёсься вялізарны ўраган-бура.

Шмат вёсак раскіданыя. Сяляне засталіся бяз гумнаў, без страхі над галавою. Есьць ахвяры і ў людзёх: шмат забіта і пакалечана пяруном. Згінула шмат скаціны. Пасевы — адзінае багацьце, якім трымаецца наш бедны селянін, зьнішчаны.

Мала таго. Сяляне ў гэтых выпадках амаль-што бязрадныя. Бабы плачуць ды моляцца да бязжаласнага неба, ходзячы каля разбуранае маемасьці; мужчыны, якія трохі мацнейшыя з гэтага боку, знаходзяцца ня ў менш прыгнечаным, навет часамі безнадзейным, становішчы. Куды зьвярнуцца! Хто паможа?—пытаюцца самі сябе.

Але ня ўсе такія.

Сьвядомы селянін, які цьвёрда пастанавіў змагацца з сваім лёсам, ня будзе безнадзейным і бяспомачным! **Змаганьне, у якое ён кінуўся, і ўдары, якія на яго сыпаліся і сыплюцца, толькі загартавалі яго, напружылі яго сталёвыя мускулы і зрабілі яго адпорным на ўсё!..**

У выпадку гэтых няшчасьцяў ён не апусьціць рукі але будзе змагацца да апошняй каплі.

У тых вёсках, дзе пранёсься ўраган, сьвядомыя сяляне павінны арганізаваць **сялянскія камітэты самапомачы**, каб шляхам арганізаваным навучыцца заўсёды сабе памагаць у няшчасьцях, бо толькі гэты шлях дасьць сапраўдную дапамогу ўсім пацярпеўшым, тым балей, што шмат хто ня ведае, дзе яе шукаць.

Дык вось, гэтыя камітэты, будучы арганізаванымі самымі сялянамі, **павінны разгарнуць самую шырокую акцыю дапамогі.** Ад імя ўсіх пацярпеўшых яны павінны зьвярнуцца да ўраду і дамагацца дзяржаўнай помачы,— праз газэты зьвярнуцца да іншых вёсак, якія засталіся цэлымі, як у краі, так і заграніцай, да работніцкіх арганізацыяў, каб яны наладзілі вулічныя зборы на дапамогу пацярпеўшым, да Гурткоў Т-ва Бел. Школы і іншых арганізацыяў.

Вось, дзе выхад з таго безнадзейнага становішча ў выпадку розных няшчасьцяў, як ураган, пажары, голад і інш.

Ніхто іншы, як мы самі, здолеем дабіцца лепшага жыцьця.

4. Прамова „нямецкага агента" аб „калідорах".

Можа, у агульную сувязь з гэтай гатовай распачацца з боку немцаў рашучай акцыяй у справе „калідору" трэба паставіць і характэрную, ці „правакацыйную", як кажа польская прэса, прамову Вальдэмараса — на апошнім кангрэсе ўрадавай партыі „таўтінінкаў" („нацыяналістаў") у Коўне 5 ліпня, ці— зараз-жа пасьля экспозэ новага нямецкага канцлера ў Рэйхстагу.

Прамова — запраўды-ж некалькі „дзіўная", асабліва калі ўспомніць, што ў той самы час, калі гаварылася, у Варшаве і ў Коўне працавалі дзьве польска-літоўскія камісіі, — у справе палітычнага гаспадарчага паразуменьня паміж Польшчай і Літвой.

Вальдэмарас цалком апублікаваў сваю прамову ў літоўскіх газэтах, адкуль падалі найбольш „цікаўныя" кавалкі з яе польскія газэты.

Вальдэмарас даказваў, што — Польшча ёсьць дзяржава штучна склёпаная саюзьнікамі з розных чужых кавалкаў—у мэтах заступіць новай сільнай дзяржавай разваліўшуюся часова Расею ды аслабіць Нямеччыну.

„Пасьля распадзеньня на ўсходзе магутнай Расейскай Імпэрыі, казаў ён, Заход хацеў стварыць такую самую сільную дзяржаву—Польшчу. Зрабілі Польшчу—коштам Расеі, Нямеччыны і Балтыцкіх краёў.

І вось, сільная Польшча паўстала, дый яшчэ сама пашырылася, карыстаючыся часовай слабасьцю суседзяў, узяла ў жалезныя кацюры чужыя землі. Дзеля яе інтарэсаў наробляна было ў-ва Усходняй Эўропе шмат усялякіх „калідораў", якія-б аддзялялі пакрыўджаных на карысьць Польшчы яе суседзяў адзін ад аднаго. „Але там, дзе зашмат калідораў, дуе страшэнны сквазьняк дый робіць вялікія шкоды"...

„Дык цяпер—пачалі выразна гутарыць аб скасаваньні калідораў“.

Але—як гэта зрабіць: ці скасаваць калідоры, аддаўшы іх яшчэ больш пашыранай Польшчы, ці наадварот—скасаваныя калідоры адабраць ад Польшчы. „Канфэрэнцыя Паслоў“ далучыла Віленшчыну да Польшчы. Думалі, што такім спосабам удасца зьвязаць Літву з Польшчай. Але цяпер палажэньне рэчаў значна зьмянілася: з дзіўнай хуткасьцяй дайшла да былой сілы Нямеччына. Нямеччына стала ізноў вялікай і магутнай дзяржавай. Дык „польскія абцугі“ ўжо страцілі сваю сілу. Дык ясна, што дні гэтых „калідораў“ — палічаны. Ясна, што павінен наступіць перагляд граніцаў, зьвязаных з „калідорамі“. „Гісторыя апошніх 6 гадоў, гэта—„гісторыя калідораў“. У першую чаргу мае быць скасаваны Гданскі Калідор. Лёкарнская Канфэрэнцыя — паміж радкоў сваіх трактатаў—прызнала гэта бясспрэчна.

Але—у зьвязку з гэтым калідорам няўхільна высунецца справа і сьцягу другіх. Такім чынам Эўропа стаіць перад пераглядам значнага раду часова праведзеных трактатамі граніцаў—на Усходзе яе. А ў цэнтры ўсіх гэтых задачаў эўрапэйскай палітыкі стаіць праблема Віленшчыны. Ці гэта цэнтральная задача Усходняй Эўропы будзе вырашана з вайной ці без вайны—гэта вырашыць добрая воля заінтарэсаваных дзяржаваў“.

Трэба думаць усё-ж, ахаміўшы вокам гэтую вязку, можа, і ня зусім дапасаваных адзін да аднаго фактаў, што — на ўсякі выпадак прымаюцца тыя ці іншыя меры, каб дыплёматычны голас заінтарэсаваных дзяржаваў гучэў асабліва „аўтарытэтна“—увосені—у часе верасьнявай сэсыі Лігі Нацыяў,—калі трэба спадзявацца рашучай пастановкі Нямеччынай раду тых дамаганьняў, аб якіх так ясна і выразна заявіў волю нямецкага народу яго новы „пацыфістычны“ дый амаль—не сацыялістычны ўрад.

Важныя заявы Брыяна і Вальдэрвэльдэ у справе акупацыі.

Экспозэ новага нямецкага ўраду 3 ліпня ўжо выклікала, паміма водгукаў у прэсе, важныя заявы з боку двух дзяржаваў, якія найбліжэй ды беспасрэдней заінтарэсаваны ў справах, парушаных канцлерам Мюллерам.

5 ліпня Брыян, прамаўляючы ў сэнацкай камісіі заграніч. спраў, заявіў—быццам у адказ канцл. Мюллеру,—што „пляи Доўса“ (якога безадкладнага перагляду трэбуе Мюллер) дый усе іншыя ўмовы Францыі з былымі саюзьнікамі дзеюць дасканала, выказваючы ясна для ўсіх учасьнікаў вялікія карысьці (пэўне-ж — для тых, хто атрымлівае грошы, але-ж не для тых, што плацяць)..

Што датычыць акупацыі Надрэніі, дык гэта залежыць ня толькі ад Францыі, але ад усіх саюзьнікаў. Адбіваючы лоўкі ўдар Мюллера, які сцьвердзіў, што толькі адна Нямеччына без засьцярогаў прыняла прапазіцыю Амэрыкі—аб трактаце, выкідаючым вайну назаўсёды з узаемных стасункаў дзяржаваў (удар галоўным чынам на Францыі, якая першая заявіла шмат такіх засьцярогаў, страшэнна абурыўшых амэрыканскі ўрад, які—адкінуў іх усе цалком...). Брыян заявіў, што „усё дазваляе думаць, што трактат Кэллёга хутка будзе прыняты ўсімі дзяржавамі“...

6 ліпня ў бэльгійскім парляманьце мін. заграніч. спраў Гіманс (ведамы сваім знамянітым праектам стварэньня незалежнай „2-кантанальнай Літвы“ — складзенай з Ковенскага-літоўскага кантону і Віленскага „польскага“...) ужо выразна адказаў на ўрадавае экспозэ канцлера Мюллера.

Ен заявіў, што Бэльгія заінтарэсавана—у справе перагляду „пляну Доўса“ і акупацыі выключна тым, каб былі забясьпечаны яе слушныя інтарэсы: бясьпечнасьць яе граніцаў і належныя ёй грошы на разбудову зруйнаванага вайной краю. Становішча Бэльгіі, яе правы на гэтыя рэчы— бясспрэчны — тым больш, што яна сама мае ваенныя даўгі Амэрыцы, якія сплачвае з нямецкіх адшкадаваньняў.

Апрача гэтага забясьпечаньня яе інтарэсаў, Бэльгія не заяўляе больш ніякіх прэтэнзіяў да Нямеччыны. Толькі-ж, зразумела, Бэльгія ня можа дапусьціць, каб зьмена спосабу сплаты адшкадаваньняў была накінута Бэльгіі без яе ўчасьця ў пераглядзе. З гэтымі засьцярогамі Бэльгія гатова падтрымаць усялякія высілкі дзяржаваў—у мэтах найлепшага канчальнага вырашэньня спорных справаў, якія высунуліся ў выніку вайны, падтрымліваючы паразуменьне і зблiжэньне паміж народамі, гаспадарчую адбудову Эўропы і г. д. (тэл. „А. Т. Е“).

Мін. Гімансу адказваў першым сам павадыр бэльгійскіх сацыялістаў ведамы Вандэрвэльдэ, некалькі разоў быўшы міністрам. Тэлеграмы сцьвярджаюць, што прамова Вандэрвэльдэ гаворыць аб даверры заграніцы да новага нямецкага ўраду...

Калі і Бэльгія адступіцца ад падтрыманьня акупацыі, тады яе бараніць астанецца можа адна толькі Польшча...

Новая праграма міжнароднага камунізму.

У адным з апошніх нумароў маскоўскай „Праўды“ надрукаваны поўны тэкст праекту новай праграмы Міжнароднай Камуністычнай Партыі, зацьверджаны ўжо Выканаўчым Камітэтам Комінтэрну. Канчальна „ў законную сілу“ праграма ўвойдзе толькі пасьля фармальнага прыняцьця праекту 4-тым сусьветным кангрэсам Комінтэрну, які мае адбыцца ў бягучым годзе, у Маскве.

Праект—таксама, як і яго першаўзор — „Камуністычны Маніфэст“ Маркса і Энгэльса, мае характэр вялікай баявой маніфэстацыі сусьветнага камунізму. Канцавы абзац Праграмы нават цалком паўтарае ведамы баявы покліч „Камун. Маніфэсту“. „Хай пануючыя клясы дрыжаць перад камуністычнай рэвалюцыяй. Пралетарыі ў ей трацяць толькі свае кайданы, а здабудуць затое ў ей цэлы сьвет. — Пралетарыі ўсіх краеў, злучайцеся“...

Уступная частка праграмы занята палемікай з сацыялізмам, аб'яднаным у II Інтэрнацыянале.

І шы аддзел Праграмы пачынаецца з агульнага нарысу лёсу капіталізму, які чакае неадхільная катастрофа. Потым ідзе агляд падзеяў апошняга 10-лецьця, якія далі ўжо шмат новага ў агульным досьледзе пралетарыяту. Досьлед гэты, зразумела, гуртуецца амаль ня выключна наваколл жыцьця і працы першай камуністычнай дзяржавы — ССРР. Калі рэвалюцыйна-сацыялістычны рух не здабыў сабе перамогі на ўсім сьвеце, дык у гэтым праект вінаваціць сацыял-дэмакратыю, якая стала выразна падтрымліваць буржуазію проці работніцкай клясы. Але, кажа праект, нямала ня спыніла ўсіх тых „унутраных супярэчнасьцяў у капіталістычнай гаспадарцы сусьвету“, якія, усьцяж разваліваючы яе—уканцы няўхільна давядуць капіталізм да катастрофы, падрыхтоўваючы канчальную перамогу ўсьцяж узрастаючаму камунізму.

Пасьля гэтага ідзе аддзел, які высьвятляе канчальную мэту камуністычнай рэвалюцыі: ажыцьцяўленьне сусьветнага камуністычнага грамадзянства-гаспадарства. Чарговыя-паасобныя этапы рэвалюцыйнага ходу і разьвіцьця гэтага непераможнага руху, частковыя мэты, гэта—скасаваньне клясавай будовы грамадзянства, спыненьне прыватнай уласнасьці, эксплёатацыі чалавечай працы, манаполія ўзгадаваньня, супярэчнасьці паміж местам і вёскай і г. д.

Калі ўсе гэтыя паасобныя, частковыя мэты будуць дасягнуты, тады само сабой будзе створана новае камуністычнае грамадзянства будучыні. Як-жа будзе зьдзейсьнены гэты вялізарны пераварот у самай падставовай будове сусьветнага грамадзянства? Зразумела, кажа праект, павінен быць можа даўгі, пераходны пэрыяд часу.—Бо ж з аднаго боку трэба, каб сільны яшчэ пакуль што капіталізм зламаў сам сябе ў барацьбе сваіх супярэчнасьцяў, якімі ўсьцяж, ідучы за ім усьлед, павінен карыстацца перамагаючы камунізм, завастраючы іх якмага. З другога боку,—ясна, што трэба і новаму камуністычнаму ладу разьвіць у часе і прасторы ўсе свае пазытыўныя вартасьці. Унутраныя супярэчнасьці капіталізму цяпер прынялі ўжо найбольш вострую ды небясьпечную для яго існаваньня форму імпэрыялізму,—канкурэнцыі імпэрыялістычных дзяржаваў. Гэтая самазабойчая канкурэнцыя выклікае ўсьцяж „нацыянальныя і каляніяльныя войны“, якія дарэшты падаб'юць тымчасовую сілу капіталізму, які ўсе менш будзе мець сілы бароцца з камунізмам і ўрэшце — будзе пераможаны ім канчальна. Апошні час высьветліў гэты працэс самазабойства імпэрыялістычнай сусьветнай буржуазіі зусім ужо ясна. Але ня трэба думаць, кажа новы „Камуністычны Маніфэст“ 1928 г., што барацьба гэтая паміж прынцыповымі ворагам: буржуазіяй і пралетарыятам—„зусім ня ёсьць мірнае здабыцьце гатовай буржуазнай машыны—шляхом апанаваньня большасьці ў парлямантах“. Не, — барацьба павінна і будзе iсьці—беспасрэднім „зваленьнем улады буржуазіі—шляхом рэвалюцыйнага акту“. Пасьля гэтага акту наступае другі пераходны пэрыяд—дыктатуры пралетарыяту,—якім пачынаецца ўжо рашучае і дакладнае ператварэньне буржуазнага ладу на камуністычны. — Усе ўстановы і рэшткі буржуазнага ладу падлягаюць пляновай і рашучай ліквідацыі. — Наступае—канфіскацыя прыватных маемасьцяў, прамысловасьці, транспарту, срэдзтваў камунікацыі, вялікшай зямельнай ўласнасьці, банкаў, гандлю, скасаваньне міжнародавых даўгоў і г. д. Пасьля ідзе—нацыяналізацыя друкарняў, манапалізацыя прэсы, кінэматографаў, тэатраў, канфіскаваньне дамоў, увядзеньне 7-гадзін. дня працы і г. д.

Так выглядае ў агульным нарысе новая праграма камунізму, зьмест якой падаем паводле вестак з польскіх газэт.

Ад Віленскае Беларускае Гімназіі.

На падставе атрыманых распараджэньняў, прыймо ў Гімназію новых вучняў можа адбыцца ўвосені толькі з дазволу Куратарыуму. Усе просьбы адрэсуюцца на імя Куратарыуму Віленскага Школьнага Вокругу, але прысылаць іх, разам з дакумэнтамі, трэба **ў Дырэкцыю Гімназіі і не пазьней 10 жніўня г. г.**

Хто перарос вымаганую норму, той ня можа быць прынятым у Гімназію. У I кл. прыймаюцца ад 9½ да 12 гадоў, у II ад 10½ да 13 гадоў, у III ад 11½ да 14 г. і г. д.

У інтэрнат пры Гімназіі будуць прыймацца толькі хлапцы **малодшых клясаў** (I—IV кл.) з платаю за ўтрыманьне ад 50 да 60 зл. у месяц пры сваім адзеньні і бялізьне. (Гэта не адносіцца да стыпэндыятаў).

За падробнымі справкамі зварочвацца ў Канцэлярыю Гімназіі. **Дырэкцыя.**

З газэт.

Пагроза голаду.

Пад такім загалоўкам украінская сялянска-работніцкае газэта „Сель-Роб“ зьмяшчае перадавіцу, у якой папярэджае ўкраінскае сялянства перад надыходам голаду.

„Украінскаму сялянству пагражае ізноў грозная катастрофа голаду.

Вострая зіма і веснавыя марозы зглумілі веснавыя засевы, і сялянства было змушана вялікую частку засеяных зямель перагараць і засеяць якрыною.

Ледзь-ледзь ператрывала нашае сялянства аграмадную катастрофу паводкі ў мінулым годзе, што зглуміла тысячы сялянскіх гаспадарак, ізноў заглядаюць голад, бяда і зьдзекі пад сялянскую страху.

Нічога іншага ня можам сказаць і аб нашым сялянстве. У тым-жа мінулым годзе пасевы ў Наваградзкам і Віленскім ваяводзтве былі зьнішчаныя бураю ды і цяпер у кожным нумары газэты ёсьць весткі, што ў тым, ці іншым, павеце збожжа зьбітае градам, разбураныя будынкі. Голад ізноў працягвае свае рукі па ахвяры з працоўных мас. Галадаючае сялянства не дастае амаль ніякай дапамогі, затое дастаюць яе абшарнікі ды кулакі. Да сялянскай беднаты, як піша тая самая газэта:

„Ад вякоў прытасоўваецца адно і тое самае правіла: давай! Давай падаткі дзяржаве: грунтовыя, даходовыя, маёнтковыя; давай дадаткі да падаткаў на гміну, на школу, на дарогі; ідзі на шараварку, стаўляй цэркаў, парахвіяльныя будынкі, аплачвай адвакатаў, калі судзішся, плаці, як у цябе народзіцца дзіця, або як нехта памёр з тваёй радні.

Усё і ўсюды, на кожным раздарожжы сялянскага жыцьця стаіць дошчачка: „плаці!“ Але да гэтай пары ніхто не сказаў гэтаму сялянству „бяры!“, бо гэта належыцца табе, належыцца табе за тваю цяжкую, мазольную працу“.

Але з чаго заплаціць? Дзе возьме селянін грошай? Хіба можа з тае жабрацкае платы, якую атрымоўліваюць сяляне, працуючы ад цямна да цямна на панскіх хвальварках, каб зарабіць нейкую там залатоўку?

І вось паўстае пытаньне, як усьцерагчыся ад гэтай грознай катастрофы голаду?

Працоўнае сялянства на сваіх хрыбтох пераканалася, што тыя „што панавалі і пануюць, нічога па свае волі не дадуць паняволеным“ і што толькі тое будуць мець, што возьмуць самі, чым забясьпечаць сябе.

Дык вось украінскае сялянства добра запамятала гэта і арганізавала ў Львове Цэнтральны Сель-Роб.—камітэт барацьбы з голадам, каб арганізаваць акцыю дапамогі галадаючым.

Няхай гэта будзе прыкладам і для беларускіх працоўных гушчаў. У выпадку голаду ў той ці іншай мясцовасьці трэба, каб сяляне арганізаваліся, каб самі сваімі сіламі і стараньнямі ратавалі і паляпшалі сваё жыцьцё. **К. Р.**

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Валі на бурага—ён павязе!

(Фэльетон).

13/VII. у маёнтку Урвідове, недалёка ад ст. Бяздáны, вада сарвала заставы і грэблі і сілай напору змыла чыгунковую насып на працягу 30-цёх мэтраў.

(З газэт).

Не загарамі — за лясамі, а ў нашай шматпакутнай старонцы, проці неба на зямлі, недалёка ад ст. Бяздáны, жылі і жывуць два панкі—Касцялоўскі і Дабароўскі. Жылі дружна, не раўнуючы як Пышка з Шышкам („Шчасьлівы муж), або Добчынскі з Бобчынскім („Рэвізор“—Гоголя), што адзін робіць, тое і другі, на яго гледзячы. Купіць сабе 20-тку ганчакоў Касцялоўскі, — глядзіш, за які тыдзень і Дабароўскі мае трыццатку; збудуе напр. Касцялоўскі ранджэрыю, насадзіць памаранчаў, хвігаў ды розных там „дзіваў“ заграніічных, бачыш, за пару месяцаў і ў Дабароўскага тое самае!

— Што за ліха!—думае першы,—пачакай-жа, суседзе, я цябе „перашчагаляю“! — і давай будаваць насыпы ды заставы на рэчцы Бяздарцы.

— Якога-ж ён зноў, д'ябла выдумаў! — ламаў галаву Дабароўскі, бачучы як дзясяткі сялян, ад цёмна да цёмна—капалі, вазілі, часалі і пілавалі дошкі. Ажна праз нейкі час бачыць у суседа чуць ня вовера—аграмадны стаў, а сам сядзіць на беражку і вудзіць рыбку. Навокал сямейка — глядзяць, сьмяюцца!

— Добры разрывак! — думае Дабароўскі—трэба і мне не паддацца!.. Тысяч 10-ць „выскачыць“, скуль узяць? Эт—думае,—пазычу! Павялічу арэнду, накіну на дровы, дык з часам і выплачу. Дый і рыбку праз пару гадоў прадаваць можна, усё-ж на рамонты зьбярэцца! —

На другі год і Дабароўскі, седзячы на беражку, вудзіў рыбку, а Касцялоўскі ажна зубамі скрыгітаў са злосьці, што ня можна ўцячы ад суседа.

Ішлі гады. Вайна. Як чорная хмара, наляцела на панскія галоўкі рэвалюцыя. Сяляне - „хамуйлы“ асьмеліліся, падвялі вушы— тое ды сёе—кажуць — а чаму так, а чаму гэдак?

Нашы знаёмыя, дай Бог ногі—ходу!

Не абыйшлося без таго, што і рыбкі ў панскіх ставах палавілі.

Трудныя часы насталі—кепская пагодка: бура, гром, маланка, град, ажна пачарнелі панкі са страху!

Але бура неяк, дзякаваць Богу, улеглася, засьвяціла зноў для нашых панкоў сонейка, прыехалі ў свае гнязьдзечкі Касцялоўскі з Дабароўскім і пачалі, адпачнуўшы, пастараму, пераганяць адзін другога, толькі ўжо зусім у другой галіне — у чыны „ўдэрылі“!

Касцялоўскі па „цывільнай“, Дабароўскі па вайсковай—палезьлі, як па драбіне, адзін перад другім, вышэй і вышэй!

Але небарак Дабароўскі прыслаб, пастарэў і з чынам падпалкоўніка падаўся ў адстаўку, а Касцялоўскі, дапяўшы да пасольскага мандату (канешне, моднай цяпер „адзінкі“!), ужо амаль ня меціць у міністры! Перашагаў, гунсвот, суседа!

— А як-жа ставы, рыбка? — Ды што рыбка? Як бачыце, дык вудзяць і цяпер, але... у мутнай вадзіцы!

Пра ставы забыліся—некалі!

Здадзена на стоража—корміць, зловіць часам на „каляцыю“, а панкам не да гэтага! З грашыма стала туга: прыход слабы, а расходаў і не пералічыш: і на „зьвёнзак“ давай, і на свае газэты давай, і на „асьвяту для люду“, давай — на „стшэльцаў“, „сакалаў“—дзе тут аб ставох ды рыбе думаць!

А тымчасам заставы падгнілі, грэблі размыліся і надовячы — Жу-у-х!!! вада са ставаў Дабароўскага ў ставы Касцялоўскага, адтуль далей, ды, як панясла „рваць“! Страхата, людцы мае! Затапіла ўсю далiну, вёску! Сяляне думалі патоп. Хрысьцяцца пабожныя ды, каторыя чуліся грэшнымі, рынуліся ў начоўках ды даўбнях да споведзі! Плывуць, плачуць!

Дабароўскі ляціць, крычыць — рыбка! Рыбка! Дзяржы! Лаві! Нясіце сеткі да „каляёвага“ маста! Там няма куды дзецца — зловім!..

Ажна дарма! Як наперла вада, дык ня толькі масток, а і сажанёў 20-ць насыпу змыла! Павісьлі рэльсы са шпаламі ў паветры!

Панок, убачыўшы гэта, чуць не самлеў!—Прапала! Прапала!..

Даць вестку на станцыю! Хоць-бы цягнік не ўляцеў—не адкараскаешся тагды ад бяды!

Паведаміў суседа. Прылятае той з Варшавы—радзяцца, бядуюць! Дабароўскі ажна плача нябарак!

— Жартачкі, кажа, тысяч трыста стратаў для калеі нарабілі! Цягнікі стаяць! А скуль я вазьму 150 тысячаў?! Бедная ты мая галованька!

— Не бядуй вельмі, суседзе,—пацяшае Касцялоўскі—як небудзь выкруцімся! Я цяпер усё-ж такі нешта значу! Падамо ў газэты, тое-сёе! Ведама, тысяч дзесятак выскачыць!

— Дзесятак, дык гэта глупства!

На другі дзень віленскія, абшарніцкае „Слова“ і „дэмакратычны „Кур. Віл“. трубілі: „Дзело збродзічых ронк“!.. „Таемнічэ рэнцэ“... „Банда“...—Успомнілі, што ўжо ня раз была гэтая спроба. (Сялянскія сьвіньні, бачыце, прыляцеўшы пацоркалі раз грэблю! (пэўне-ж з умыслам)!

— Кусы, кусы!—валіце, знача, на вёску, арыштуйце з паўсотні сялян, ды „збадайце“ добра, дык і прызнаюцца!

Панаехала паліцыі, сышчыцкіх сабак прывязьлі,—сьляды, знача, шукаць! Але тыя, каб на іх дохля, панюхаюць, панюхаюць, заскавычуць і ў маёнтак пруцца! Як ты іх ня пхай да вёскі—ня йдуць!

— Кепска яны—кажуць панкі — дрэсыраваныя!

Прыехала камісія, агледзілі прорву, гніякі ад ставоў, паківалі галовамі, гледзячы на Дабароўскага і... нешта хацелі сказаць, але той так жаласна плача, такая „скруха“ выражаецца на яго твары, што проста не хапае сьмеласьці раззявіцца—дык пакуль-што маўчаць. А віленскія газэткі сваё дзела правяць,—Банда! Згавор! Пашукайце добра!—толькі вось эндэцкая (ці не шкадуючы бандытаў-камуністых?!) гэты консононс псуе. Піша, што ўсяму вінаваты ўласьнікі „Урвідова“, занядбалі пра заставы і што мусяць заплаціць за страты. Здурнелі эндэкі! Гэдак скрыўдзіць людзей хочуць!

Ня ведама яшчэ, на чым скончыцца гэта справа, але мы радзілі-б вакалічным сялянам (асабліва, якія маюць адвагу чытаць газэты) прыгатаваць па торбачцы сухароў, бо-ж можа і прыдзецца пакаштаваць „рыбнай юшачкі“, а бяз хлеба-ж, як ведама, ня смачна будзе! А пану Дабароўскаму—успакоіць свае нэрвы; неяк-жа ўладзіцца гэта справа, цяперача такія пагодныя, сонечныя дзянёчкі, свой сваяка... ня скрыўдзіць, так што дарма і сумаваць нечага!

Язэп Калючы.

„JUNGDO“.

(Баявая прамова павадыра „Молада-Нямецкага Ордэну“ ў справе „польск. калідору“).

Што адкрыта высунутая новым урадам праграма перагляду трактатавых варункаў існаваньня Нямеччыны зьяўляецца агульна нацыянальнай праграмай Нямеччыны, дый што яе рэалізацыя будзе праводзіцца ў арганічным паразуменьні і супрацоўніцтве ўсіх чыньнікаў нацыянальнага жыцьця краю, чарговым доказам гэтага зьяўляецца прамова „Вялікага Майстра“ Молада-Нямецкага ордэну (скарочана па нямецку — „Jungdo“) Маараўна, сказаная ім на чарговым кангрэсе гэтай арганізацыі ў Данцыгу.

Прамова гэта надрукавана цалком ў органе гэтага ордэну „Малады Немец“ і зараз-жа з ахярмам перадрукавана ў польскіх газэтах („K. Warsz“. 12-VII).

„Молада-нямецкі ордэн, казаў „Вялікі Майстар“, ёсьць і застанецца баявой арганізацыяй. Калі б сёньня Нямеччыне гразіла з боку Польшчы якая небясьпека, — мы ня спыніліся-б перад распачацьцем новай, яшчэ вялікшай буры, як папярэдняя“... Далей „Майстар“ Маараўн даводзіць, што — перад тым, як канчальна рашыцца на новую вайну, трэба спрабаваць усе шляхі і спосабы мірнага паразуменьня з дзяржавамі ў справе перагляду немагчымых для нямецкага народу варункаў, накінутых гвалтам у мірным трактаце, а ў першую чаргу — скасаваньня „польскага калідору“...

Адзіным найвярнейшым дыплёматычным шляхам да гэтай мэты п. Маараўн лічыць — паразуменьне з Францыяй, якое адразу разарве тое жалезнае кольца няпрыяцельскіх саюзаў, у якім цяпер задыхаецца Нямеччына.

Ані Італія, ані навет Англія не дадуць таго Нямеччыне, што дасьць прыязная і саюзная Францыя, пераканаўшаяся ў непатрэбнасьці для яе дый шкоднасьці для эўрапэйскага міру — яе вазных саюзаў з Польшчай і інш. дзяржавамі „францускага кольца навакол Нямеччыны“... Місія Нямеччыны ляжыць на ўсходзе, дзеля таго Нямеччына павінна за ўсялякую цану стварыць для сябе мір і саюзьнікаў на заходзе!... толькі ў тым непажаданым для немцаў выпадку, калі Францыя адмовіцца ад паразуменьня і кайданы вэрсальскага трактату ня можна будзе скінуць мірным шляхам, толькі тады Нямеччына змушана зьвярнуць свой меч і проці Францыі! ..

Выключае п. Маараўн карысную ролю Радавай Расеі ў вызваленьні Нямеччыны: СССР імкнецца толькі да сусьветнай рэвалюцыі, дык сувязь з ёй толькі шкодзіць „нямецкаму міру на Заходзе“!...

Вялікую частку сваей прамовы „вялікі майстар“ пасьвяціў чарговай, пякучай справе — скасаваньня „гданскага калідору“ і польскага сэрвітуту ў Данцыгу.

„Наша права да „калідору“ — бясспрэчна“, казаў ён. Але карэнь пасьпеху нашай справы — у Францыі. У свой час мы пайшлі да Францыі ды сказалі ей у яе сталіцы ўсю праўду аб вэрсальскім трактаце, высьвятліўшы жыцьцёвую неабходнасьць для Нямеччыны вырашэньня гэтай справы. І мы дабіліся таго, што гэты трактат быў ня прызнаны падставай эўрапэйскага міру (п. Маараўн кажа тутака аб кангрэсах так зван. „Фідаку“, міжсаюзьніцкай арганізацыі ці ўчасьнікаў Вялікай вайны). „Мы заявілі тады ясна і выразна, што для Нямеччыны ня можа быць міру, калі гэтым „мірам“ мае быць — вэрсальскі. І польская тэза — аб тым, што „вэрсальскія міравыя дыктаты прызнаюцца падставай міру, была адкінута“... „Мы выкарыстаем усе сілы, каб здабыць запраўды справядлівы мір, але,—першым крокам на шляху да гэтага міру павінна быць— залячэньне тэй крывавай раны, на целе Нямеччыны, якой зьяўляецца „польскі калідор“ з Гданскам“... „Ня можа быць міру датуль, дакуль „польскі калідор“ ня будзе зьвернены Нямеччыне і Усходняя Прусія — злучана з рэштай Нямеччыны. Будзе гэта цяжкая барацьба, але толькі яе шляхам немцы здабудуць ізноў сваю вольнасьць“. Аратар казаў, што на бліжэйшым кангрэсе „Фідаку“ нямецкая дэлегацыя рубам паставіць справу „калідору“, зьвярнуўшыся да яго з вялізарным матэрыялам даводаў, над якім цяпер працуе шмат вучоных гісторыкаў.

„Справу Гданска“ аратар лічыць „ужо фактычна вырашанай: ад часу паўстаньня ўласнага польскага порту ў Гдыні, Гданскі порт Польшчы — ужо больш непатрэбны“... „Калідор“ быў адабраны ў Нямеччыны ня шляхам плебісцыту, але шляхам гвалту. Выгнана з яго гвалтам сотні тысячаў немцаў. Але — ніякі мір ня можа быць трывалым, калі абапёрты на гвалце. Дык мы трэбуем звароту „калідору“ — бо-ж ня можам і ня хочам жыць з гэтым ражном, убітым у цела Нямеччыны. Нямецкі народ ня будзе мець спакою, пакуль гэтая крывавая рана ня будзе загоена“.

У канцы аратар прывёў цікаўную спраўку, быццам, — сам Дмоўскі ў сваім мэмарыяле да прэз. Вільсона 8 кастрычніч. 1918 г. заявіў, што для Польшчы „калідор“ ня мае вартасьці, калі адначасна да яе ня будзе далучана і Усходняя Прусія: Калі Усходняя Прусія будзе пакінута Нямеччыне, дык і Заходняя Прусія з „калідорам“ павінна астацца ў ей-жа...

Кончыў сваю прамову „Вялікі Майстар Ордэну Нямецкай Моладзі“ заклікам, — першая мэта наша ў барацьбе за вызваленьне, гэта — скасаваньне „польскага калідору“!...

— —

Што-жа такое гэты „Молада-нямецкі Ордэн“, якая яго сіла ў краі? „Гэта — аб'яднаньне паміж-партыйнае ды ўсеклясовае, напалову маральнае — напалову палітычнае. З-паміж партыяў выключае яно толькі камуністаў. Сябры „Ордэну“ завуцца на даўні лад царкоўных сярэднявечных ардэноў — „братамі“ ды „сёстрамі“. У лоне Ордэну пануе жалезная дысцыпліна. Ордэн налічвае звыш мільёну сяброў — з блізу 15.000 правінцыянальных аддзелаў.

Ад больш нацыяналістычнага „Штальгэльму“ гэты „Молада-нямецкі Ордэн“ адрозьніваецца сваімі францускімі сымпатыямі, што пэўне-ж дае гэтай усе-нямецкай арганізацыі вялікія казыры ў яе палітычнай ігры...

Павадыры „Ордэну“ часта езьдзяць у Парыж, вядуць усьцяж гутаркі з рознымі вельмі ўплывовымі францускімі дзяржаўнікамі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Ад'емны гандлёвы білянс Польшчы.

Прэса (Gł. Prawdy № 199) падае тымчасовыя аблічэньні Галоўнага Статыстычнага Ураду гандлёвага білянсу Польшчы за месяц чэрвень г. году.

Паводле гэтых даных у м-цы чэрвені прывезена ў Польшчу тавараў на 289,500,000 злотых. Вывезена ў гэтым-жа месяцы з Польшчы тавараў на 191,961,000 злотых.

З гэтага бачым, што дэфіцыт (недахоп) Польскага гандлю за апошні мінулы месяц раўняецца 97,549,000 злотых.

Мусім адзначыць, што ў параўнаньні за травень г. году прывоз у чэрвені зьменшыўся на 6,960,000 злотых, а вываз 9,814,000 злотых. Ці ня сьведчыць гэта аб нейкім заміраньні польскага гандлю? А аб чым-жа сьведчыць усё ўзрастаючы кожнага месяца яе ад'емны гандлёвы білянс?

Вялікая бура ў Люблінішчыне.

Надовячы над Седлецкім і Любартоўскім паветам прайшла вялікая бура з пярунамі і градам. Апрача цэлага раду пажараў і іншых вялікіх матэр'яльных стратаў, пярунамі забіта 4 чалавекі.

Забастоўка гарбаршчыкаў.

У гарбарні Пэлліс у Львове даўно трывае забастоўка. Забастаўшчыкі дамагаюцца: 1) 25 прац. падбаўкі, 2) зьвярненьня ўмовы адносна прыняцьця новых работнікаў і 3) за 8 гадзінны дзень працы.

Забастоўка ў хмялярнях ў Брыдшчыне.

Ужо два тыдні, як трывае забастоўка ў 7-х хмялярных у маёнтках Руда і Бэрлін, Брыдскага пав. (вядомых абшарнікаў Шмідтаў). Бастуючыя дамагаюцца падбаўкі і 8 гадзіннага дня працы.

Міжнародны капітал закупляе лясы ў Польшчы.

Як падае 35 нумар украінскай часопісі „Нашэ Слово“, ад вялікага галіцыйскага абшарніка барона Лісіга заграпічнае Акцыйнае Т-ва Дзеравянага Промыслу закупіла 70 000 маргоў лесу ў паветах Турка, Самбор і Стрый. Ад гэтага-ж самага абшарніка тымжа таварыствам куплена 60 000 маргоў лесу ў Салотвінскім, Багарадчанскім і Станіславоўскім паветах.

А ці йначай гаспадарыць Польшча і над лясамі Зах. Беларусі?

Заграніцай.

Прамова Бухарына на кангрэсе Комінтэрну.

На кангрэсе Комінтэрну, які адбываецца ў Маскве, Бухарын у справаздаўчай прамове аб дзейльнасьці выканаўчага камітэту Комінтэрну—паміж іншым сказаў, што — барацьба капіталістычных дзяржаў з пралетарыятам робіцца ўсё гвалтаўнейшай—у выніку ўсьцяж адбываючайся адбудовы капіталістычнага ладу ў сьвеце і ўзросту прадукцыі. А гэта вымагае новага падзелу сьвету, а гэта значыць — новай вайны. Вайна для капіталістычных дзяржаваў—адзіны шлях і спосаб такога перадзелу сьвету. Таму — Камінтэрн павінен зорка сачыць за падзеямі, імкнучыся да кансалідацыі сваіх уплываў у сялянскіх масах, а таксама да таго, каб зьвязаць клясавую барацьбу пралетарыяту Зах. Эўропы з вызваленчай барацьбой каляніяльных народаў проці імпэрыялістыч. дзяржаваў.

Ваенныя алярмы ды падрыхтаваньні на літоўскім пагранічча.

У зьвязку з маючымі адбыцца манэўрамі (?) на літоўска-польскім пагранічча — літоўскія ўлады паставілі на ваеннае палажэньне ўсё пагранічча з Польшчай. Апроч таго, у Вількаміры, Кальварыі, Шаўлях і інш. таксама прыняты меры вострай ваеннай гатоўнасьці, прычым з гэтых пунктаў, а таксама з Коўны фарсаваным маршам перакінуты значныя вайсковыя сілы — на пагранічча. Гэтыя экстраныя перакідкі значных вайсковых масаў выклікалі быццам страшэнную паніку ў літоўскім меставым грамадзянстве і ў сялянскіх масах.

У краі ходзяць чуткі, быццам Коўна — напярэдадні рашучага крызісу: сітуацыя дайшла быццам да крайняга напружаньня, па якім павінен наступіць выбух.

Так прынамсь паведамляе мясцовая віленская прэса.

Умяшацельства нямецкага і радавага ўрадаў у польска-літоўскі канфлікт.

Нямецкая прэса падае сэнсацыйную вестку, быццам нямецкі і радавы ўрады пастанавілі абодва, але самастойна, учыніць у Коўне дыпляматычны націск на літоўскі ўрад — у напрамку залагоджаньня польска-літоўскага спору. Нямецкая прэса толькі запярэчвае вестцы, паданай англійскай газэтай, быццам гэты націск зроблены ў Коўне супольна абодвума ўрадамі.

„Рабочая Газэта“ аб магчымасьці вайны з-за Літвы.

„Рабочая Газэта“ піша, што аружны канфлікт паміж Польшчай і Літвой бязумоўна давёў-бы да новай эўрапэйскай вайны. Бо-ж безбаронная Літва ня была-бы пакінуна адной — у барацьбе з сільнейшай Польшчай. Новыя ваюючыя коаліцыі зляжыліся-б тады, кажа газэта, так, што—на адным баку былі-б Англія, Францыя і Польшча, на другім—Рады, Нямеччына і Літва.

Зьезд вышэйшых камандзіраў літоўскай арміі.

У Коўне ў бліжэйшых днёх мае адбыцца зьезд вышэйшых камандзіраў літоўскай арміі, на якім маюць оказаць важныя палітычныя прамовы прэзыдэнт Сьметона, прэм'ер Вальдэмарас і ваенны міністар Даўкантас.

Нямеччына прапусьціла Бела-Куна ў СССР.

Нямецкія газэты даносяць, што нямецкі ўрад згадзіўся прапусьціць праз тэрыторыю Рэспублікі засуджанага венскім судом на высылку з граніцаў Аўстрыі ведамага павадыра вэнгерскіх камуністаў Бела-Куна. Як ведама, вэнгерскі ўрад патрэбаваў выдачы яму Бела-Куна, дык праз Вэнгрыю праехаць Бела-Куна ня мог; польскі ўрад рашуча адмовіў на прапазіцыю аўстрыяцкага ўраду — прапусьціць праз польскую тэрыторыю Бела-Куна—у СССР. Тады аўстрыяцкі ўрад зьвярнуўся да Нямеччыны і Чэха-Славакіі, якія згадзіліся — „з пагляду на прыязьнь да Аўстрыі“—споўніць просьбу яе ўраду.

Знаменныя візыты.

Нямецкія газэты цьвердзяць, што францускі генарал Ле-Рон прымае ўчасьце ў манэўрах румынскай арміі—на вэнгерскай граніцы ў Сяміградыі. Газэты дадаюць, што абяцаная візыта марш. Пілсудскага ў Румынію — быццам у адказ на візыту румынскіх генаралаў у Варшаве—зьвязана з справай — паглыбленьня польска-румынскага саюзу.

„Рада 4 генаралаў“ і лічба кітайскай арміі.

„Рада 4 генаралаў“, якая фактычна правіць цяпер Кітаем, пастанавіла, што кітайская армія мірнага складу павінна мець 750 тысяч жаўнераў.

Кітай—праз 15 гадоў.

Кітайскі генарал Чанг-Кай-Шэк—у прамове да пэкінскіх студэнтаў—заявіў, што кітайская студэнцкая моладзь павінна ўзгадоўвацца ў ваенным духу — каб Кітай праз 15 гадоў меў такую армію і флёт, якія маглі-б вытрымаць націск любой дзяржавы на сьвеце.

Усекітайскі кангрэс партыі Куомінтангу.

У бягучых днёх у Нанкіне мае адбыцца ўсекітайскі кангрэс партыі Куомінтангу, на які зьедуцца і ўсе вышэйшыя камандзіры паўдзённых арміяў.

Англійская работніцкая партыя выражае недаверра ўраду.

Англійская „Партыя Працы“ пастанавіла выразіць недаверра ўраду — у зьвязку з яго палітыкай у справе безрабоцьця.

Чэмбэрлен аб скасаваньні акупацыі Надрэніі.

Адказваючы на інтэрпэляцыю ў парляманьце, Чэмбэрлен заявіў, што англійскі ўрад вельмі сымпатызуе дамаганьню нямецкага канцлера ў справе скасаваньня акупацыі. Але — перадчасная эвакуацыя Надрэніі можа—на падставе Трактату—адбыцца толькі шляхам паразуменьня нямецкага ўраду з акупацыйнымі дзяржавамі, прычым голас у гэтай справе маюць таксама і дзяржавы, якія ня маюць войскаў у Нямеччыне, але падпісалі Вэрсальскі Трактат (чытай: Польшча, Чэха-Славакія, Румынія і інш.).

Што датычыць спэцыяльна Англіі, дык яна — гатова разглядзець зычліва ўсялякія прапазіцыі, якія высунуць дзяржавы, бліжэй заінтэрэсаваныя ў гэтай справе, але сама Англія ў сучасны мамэнт ня возьме на сябе пачыну скасаваньня акупацыі.

Такім чынам Англія пакідае цалком справу на вырашэньне Францыі з яе саюзьнікамі.

Школьная працоўня прыроды і Віленская Белар. Гімназія.

(Глядзі № 6 „Сьцяг Працы“).

Роля вучыцеля ў часе працы вучняў была кіраўніча-дарадчай. Вучыцель радзіў вучням, што ўзяць спачатку, што зрабіць потым, прыглядзіцца да тых зьмен, якія адбываліся ў часе досьледу, зарысаваць досьлед, запісаць галоўныя думкі і г. д.

Адначасна вучыцель сачыў за тым, каб кожны вучань абавязкова працаваў, г. зн. прарабляў усё тое, што патрэбна было прарабіць у часе дадзенай лекцыі.

Апрацаваны на лекцыі матэрыял зьвязваўся вучыцелем з цэлай прыродай, або з жыцьцем грамадзянства.

У канцы кожнай лекцыі ў кожнага вучня абавязкова заставаліся кароценькія зацемкі на паперы галоўных думак з лекцыі і тых рысункаў, якія зьявіліся ў рэзультаце зарысоўкі сваіх досьледаў.

Гэтыя зацемкі ў канцы вучэбнага году складалі невялічкую кніжку (канспэкт), напісаную самім вучнем і вельмі цэнную для яго пры падгатоўцы лекцыяў на наступны дзень, а таксама пры паўтарэньні ўсяго курсу. Далося заўважыць, што вучні ў часе працы ў школьнай працоўні заўсёды з вялікім зацікаўленьнем і ахвотай прараблялі ўсё тое, што казаў ім вучыцель, захоўваючы пры гэтым поўны парадак і цішыню.

Ня гледзячы на абмяжаваньне часу ў школьнай працоўні да трох гадзін ў тыдзень, у гэтым школьным годзе Віленская Белар. Гімназія (першыя чатыры клясы) здолелі апрацаваць наступны матэрыял.

З пропэдэўтыкі фізыкі: мераньне, аблічэньне абыйма целаў правільных і няправільных. Меркі вагі і важаньне. Гушчыня целаў. Зьмена абыйма целаў пад уплывам цяплыні. Тэрмомэтр. Тэмпэратура мешаніны. Калёрыя. Цяплыня таяньня лёду. Ахаладжваючыя мешаніны. Кіпеньне. Параваньне. Скрапленьне пары. Праваднікі цяплыні. Расшырэньне цяплыні. Фільтраваньне і дыстэляцыя вады. Магніт. Электрыка. Паўставаньне электрыкі ад церця. Электроскоп. Праваднікі электрыкі. Электрычныя батарэі Вольта, Грэнэ. Хімічныя і цеплавыя дзеяньні току. Электромагніты і іх застасаваньне.

З мінэралёгіі: кухонная соль, гіпс, мрамар, граніт, серка, вугаль.

З хіміі: Азот. Кісьлік (тлён). Двутлёністы вугаль. Злучэньні кісьліка з серкай, жалезам і іншымі целамі прыроды. Вадарод. Асновы і кісьлі. Солі. Вугляводы і Вуглевадароды. Нефць.

З анатоміі расьцін (досьледы з мікраскопам). Клетка. Форма клетак. Будова клеткі. Хлёрофілавыя зярняты. Рух пратаплязмы ў клетцы. Тканіны. Судзіны. Дрожджы і іх размнажэньне. Інфузорыі.

Дзеля малае колькасьці гадзін, вызначаных у працоўні на жывую прыроду, большасьць лекцыяў з заолёгіі і батанікі была адроблена ў Гімназіі, пры дапамозе тых табліц і чучалаў зьвяроў і птушак, якія маюцца ў Гімназіі.

Аднак-жа па, праходжаньні пэўнай сям'і птушак або зьвяроў дзеці хадзіліся ў школьную працоўню, дзе і паўтаралі ўсю сям'ю, маючы перад вачыма поўны камплект чучалаў, датычачых гэтай сям'і. Пры вучэньні расьцін, вызначаных у праграме гімназіі, рабіліся экскурсіі ў батанічны гарод працоўні, або прыносіліся ў клясу патрэбныя да лекцыі расьціны з запасовых градак батанічнага гароду.

Праходзячы жывелы і расьціны цёплых старонак, былі выкарыстаны багатыя камплекты заолёгічных і батанічных карцін працоўні, а аднача з тым і чароўны фанар школьнай працоўні.

На экране дзеці бачылі ня толькі паасобных прадстаўнікоў цёплых краін, але і тыя абставіны, сярод якіх яны жывуць (пустыня, стэп, трапічны лес і г. д.).

Апрача ўсяго пералічанага, у школьнай працоўні адбылося некалькі спэцыяльных падгатаваўчых лекцыяў з прыроды да школьных экскурсій.

Тэмаю аднае з такіх лекцыяў была: сухая перагонка дрэва.

Дзеці лябараторным спосабам спачатку самі дабылі асьвятляючы газ, смалу, дравяны воцат, а пасьля хадзілі на віленскі газовы завод, дзе ўбачылі той самы працэс, толькі пры другіх абставінах.

У канцы гэтага школьнага году адбыліся экскурсіі на электрычную станцыю, лесапільны завод, паравы млын, папяровую фабрыку ў Кучкурышках і шкляную гуту.

Большасьць з пералічаных экскурсіяў адбылася з удзелам гімназіяльнага аркестру.

Астаецца пажадаць, каб сувязь, устаноўленная Віленскай Беларускай Гімназіяй з школьнай працоўняй, у гэтым вучэбным годзе не парвалася, а наадварот узмацавалася і пашыралася з наступнага школьнага году не на адну прыроду, а і на другія прадметы.

Присутны.

Ад рэдакцыі. Мусім зазначыць, што, як мы даведаліся, хаджэньне вучняў Віл. Бел. Гімназіі ў працоўню прыроды пачалося толькі ў мінулым 1927/28 школьным годзе, калі на вучыцеля прыроды быў запрошаны грам. М. Пяткевіч, які адзначыўся паміж многімі іншымі дадатнімі бакамі, як вучыцеля, і такою добраю пастаноўкаю выкладаньня прыроды ў Гімназіі.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

Апошняе слова Акіньчыца.

Закідвае мне пракуратаратура, што я падчас расейскай рэвалюцыі браў у ёй удзел і працаваў у Наўгарадзе ў камуністычнай партыі і належаў да розных арганізацыяў. Закідвае яшчэ, што ў час рэвалюцыі, а навет і праз увесь папярэдні час, я быў заўсёды расейцам і ніколі не пачуваўся да беларускаці. Ці-ж пракуратаратура паслугоўваецца дагадкамі, бо скуль-жа гэтыя даныя, скуль ведае яна маю душу?! Мушу катэгарычна гэтаму усяму запярэчыць, бо ніколі я не належаў да камуністычных арганізацыяў, і ў той час, калі мне закідваецца, што я браў актыўны ўдзел у 1917 г.,—я быў толькі вучыцелем у гімназіі ў Наўгарадзе. Пракуратаратура зазначыла, паміж іншым, што я, выкарыстоўваючы сучасныя абставіны, хоць і чуюся расейцам, пад плашчыкам беларуса пачаў вясьці працу ў Грамадзе, у характары праўнага радцы. Проці гэтага катэгарычна заяўляю, што я заўсёды ўважаў, заўсёды лічыў сябе за Беларуса, ня гледзячы на тое, што гэтая меншасьць у сучасны мамэнт зьяўляецца найбольш перасьледаванай, аднак, не выракаўся яе і не зракуся ніколі, навет цяпер, седзячы на лаве падсудных, а сьмела і адкрыта да яе прызнаюся. Што датычыцца іншых закідаў, зробленых мне — ўважаю, што Высокі Суд ня будзе прыдаваць ім значэньня, дзеля таго, што сьведкі, якія для мяне былі вельмі важныя, не зьявіліся на суд, ня гледзячы на тое, што я з уласнага кішаня пераслаў суду на гэтых сьведкаў 150 зал. На гэтым Акіньчыц скончыў сваю прамову.

З іншых абвінавачаных забіраюць голас Беламызы і некалькі іншых. Рэшта зракаецца апошняга слова. З тых, што забіралі голас, некаторыя, змучаныя даўгім сядзеньнем у вастрозе і ня ведаючы, у чым іх абвіняюць, проста казалі: „мы ня ведаем, у чым нас абвіняюць і чаго мы тут сядзім".

На наступным паседжаньні Суд пастанаўляе прыступіць да рэдакцыі пытаньняў, зьмест якіх мае выразіць тое, у чым абвіняюць падсудных.

Заканчэньне працэсу Б. С. Р. Гр. (18. V. 28 г.).

56 паседжаньне Суда закончыла судовы правод. На гэтым паседжаньні Суд зрэдагаваў пытаньні, ад адказу на якія залежыць прыгавар. Зьмест пытаньняў наступны: 1) Ці абвінавачаныя вінаваты ў тым, што ў часе ад 1926 г. і да палові студзеня 1927 г. прыймалі ўдзел у „śpisku" (загаворы) пад назовам „Бел. Сял. Раб. Грамада", заснованым з мэтай дакананьня „перавароту" ўстаноўленага шляхам падставовых правоў дзяржаўнага ладу Польшчы, нарушэньня цэласьці яе тэрыторыі і ўвядзеньня дыктатуры пралетарыяту і радавага ладу, адарваньня ад Польшчы шляхам аружнага паўстаньня і далучэньне да Радавай Расеі паўночна-ўсходніх ваяводстваў, прычым дзеля зьдзейсьненьня гэтае мэты распараджаліся складамі аружжа, аб чым самі ведалі. 2) Ці будучы грамадзянамі Польшчы і дзеючы сьвядома і супольна, далі забавязаньне ўраду Радавае Расеі аказаньня яму аружнае помачы ў прыпадку вайны з Польшчай. 3) Адносна абв. Куліны-Куліноўскага—ці ў часе ад 1926 г. да канца студзеня 1927 г. наўмысьля і бясправўна перадаваў радавым уладам весткі, датычачыя вайсковае абароны дзяржавы і паміж іншым інфармаваў радавую камэндантуру ў Слабодцы аб лічбавым стане і дыслёкацыі польскіх вайсковых аддзелаў і пастарункаў паліцыі на радавым пагранічча. 4) Адносна абвінавачаных Казачонка, Каваяева, Кавалевіча Карніловіча—ці вінаваты ў тым, што 14. X. 26 г. ў вёсцы Дзедзіна стараліся схапіць канфідэнта паліцыі Івашкевіча і выдаць яго радавым уладам за ўстаноўленую згары плату.

Далейшыя пытаньні абыймаюць справу коштаў і аплат судовых, рэчавых доказаў і г. д. Найвялікшую труднасьць мела першае пытаньне. Пракуроры Калапскі і Рaўзэ запрапанавалі дадаць на выразе „śpisku" словы: „створаным у арганізацыі пад наз. Грамада". Абарона гвалтаўна спраціўлялася гэтаму. Суд, па даўгіх дыскусіях і нарадах, утрымаў першую рэдакцыю, якую мы ўжо падалі вышэй. Словы-ж „прычым, для зьдзейсьненьня гэтага распаражаліся складамі аружжа, аб чым самі ведалі", суд дадаў на падставе дамаганьняў абароны.

Па ўстанаўленьню пытаньняў старшыня Суду Аўсянка аб'явіў, што прыгавор будзе аб'яўлены ў аўторак, г. е. 22. V. 28 г.

Зьмест прыгавору ў сваім часе быў паданы нашым чытачом.

(Канец).

Наша хроніка.

„Ігла" перад Акружным Судом. Як падае прэса („Słowo" № 163), Акружны Суд у Вільні 18 г. месяца меўся разглядаць справу арганізатараў і дзеячоў раённага камітэту Камун. Парт. Зах. Беларусі ў Вільні, якія, залажыўшы ў 1926 годзе прафэсыянальны саюз „Ігла", прыгатоўвалі паўстанчы рух, маючы на мэце адарваньне ад Польшчы часьць тэрыторыі і прылучэньня яе да Радавай Беларусі.

Віленская газэта кажа, быццам у падсудных знойезены ў часе сьледзтва шыфраваныя нататкі, што яны мелі 110 ружжаў, 26 рэвальвэраў, 27.248 набояў, 800 бомбаў і вялікі лік іншых матар'ялаў (а аб тым, ці знойдзена што ў часе ліквідацыі з гэтага складу ці не, газэта нічога ня кажа).

Ліквідацыя „Іглы" адбылася ў канцы мінулага году, вынікам чаго абвіняецца з 102 арт., II ч. К. К. 8 чалавек, з якіх адзін уцёк, як кажа „Słowo", у Радавую Расею.

Абараняюць некалькі віленскіх адвакатаў і адв. Гонігвіль з Варшавы. Па спраўджэньні пэрсаналю абвінавачваных, суд сцьвярдзіў, што не зьявілася некалькі паважных сьведкаў, як кіраўнік сьледчага аддзелу камісар Навакоўскі, падкам. Буткевіч і вядомыя з працэсу „Грамады" Бабіч і Вашынскі.

Пагроза забастоўкі. Работнікі, працуючыя ў фабрыцы драўняных вырабаў у Новай-Вялейцы, зажадалі надовячы ад дырэкцыі фабрыкі 15 прац. падбаўкі. У разе адмовы—работнікі пагражаюць забастоўкай.

І пекары пагражаюць забастоўкай. Прафэсыянальны Саюз Пекароў у Вільні зажадаў ад працадаўцаў падпісаньня зборнай пекарскай умовы на 1928—29 год.

У разе адмовы працадаўцаў — пекары пагражаюць забастоўкай.

Камуністычныя тэхнікі. Польская віленская прэса падае, што надовячы ў раёне Радашкавіч аддзелы польскай пагранічнай стражы затрымалі 3 камуністычных „тэхнікаў". Пры арыштаваных быццам знойдзены цэлы рад кампрамітуючых дакумэнтаў.

Пажары. Апошнімі днямі ў Горадзеншчыне было многа пажараў, як у вёсцы Кашаўнікі, з якой да Горадні толькі 3 вярсты. І ня гледзячы на такую малую адлегласьць, ані гарадзкая пажарная каманда, ані ахвотніцкая—ня прыехалі ратаваць бедных сялян.

Цікава, — калі-б гарэў абшарніцкі двор, ці прыехала б помач?

Ганьба такім пажарнікам!

У тым-жа самым Горадзенскім павеце ў калёніі Малятычы, Мала-Браставіцкай воласьці, згарэла хата і будынкі Юльяна Ліськевіча. Апрача пажару, пярун забіў 64 гадовую Марыю Ліськевіч.

Трэці пажар, ад якога згарэла толькі адно гумно, здарыўся ў вёсцы Пырах, Азёрскай воласьці. Прычына пажару — неасьцярожнае абходжаньне з агнём.

Нязвыклы скарб. Адзін з работнікаў, працуючых на рабоце пры будове жалезнадарожнай лініі на шляху Луцк — Стаякова, найшоў нязвыклы скарб. Справа ў тым, што гэты работнік наткнуўся пры капаньні зямлі на 2 урны з залатымі і сярэбранымі манэтамі з адбіткамі рымскіх імпэратараў Адрыяна і Антаніны з 1-га веку па Растве Хрыстовым.

Ня могучы забраць дзьвёх урнаў, работнік уцёк з урнаю з залатымі манэтамі.

Астаўшыяся сярэбраныя манэты разабрала мяйсцовая люднасьць.

Чырвоны сьцяг у Вільні. Як падае „Kur. Wil." (№ 163), ноччу 20-га г. месяца на тэлеграфных дратох Дзераўніцкай вуліцы быў вывешаны чырвоны сьцяг з лёзунгамі 3 інтэрнацыяналу. Паліцыянт зьняў гэты сьцяг і аднёс у камісарыят.

Перамога работнікаў. Апошнімі днямі працаўнікі Горадзенскіх пекарняў дабіліся ад сваіх працадаўцаў 20 прац. падбаўкі. Трэба адзначыць, што змаганьне работнікаў за гэтую падбаўку трывала досыць доўга.

Напад на плебанію і цяжкае пабіцьце ксяндза. Апошнімі днямі на Ваўкавыскую плебанію напала некальлі бандытаў, пачаўшых яе грабіць. Калі-ж гэта пачуў брацейнік ксяндза і нарабіў крыку, бандыты пачалі ўцякаць. За імі пагнаўся ксёндз Глухоўскі і ўсьпеў злавіць аднаго бандыта. Вырываючыся, бандыт ударыў ксяндза некалькі разоў па галаве цяжкай жалезнай штабай, дзякуючы чаму зладзей і ўцёк.

Стан здароў'я ксяндза вельмі цяжкі. З бандытаў яшчэ не адзін ня злоўлены. Так падае гэтую вестку 206 нумар „Rzeczypospolitej".

Яшчэ бандыты. Як пішуць газэты, уночы з 16 на 17 г. м. азброеная рэвальвэрамі банда з некалькіх маладых чалавек напала на памешканьне Язэпа Латвіса, жыхара вёскі Нясковічы, Варнянскай воласьці. Стэрорызаваўшы і зьвязаўшы сям'ю Латвіса, бандыты забралі ў яго 1.500 даляраў і 15 рублёў золатам. Па чым забраліся да нейкага Каркевіча, у якога забралі таксама ўсе грошы. Пасьля гэтага бандыты ўцяклі ў лясы ў кірунку Аранаў.

Паведамленая паліцыя арыштавала ў Аранах 5 западозраных асобаў.

З Т-ва Бел. Школы.

Праца Гурткоў Т-ва Белар. Школы.

× 16/IV. г. г. Гуртком Т-ва Бел. Шк. у в. Іванкавічы, Маўчадзкае гм., Баранавіцкага пав., быў наладжаны спэктакль. Адыгралі „Заручыны Паўлінкі" і „Боты", а таксама дэклямавалі вершы. Спэктакль прайшоў вельмі добра, а людзі, якіх сабралося з цэлай вёскі, так яго спадабалі, што прасілі, каб паставіць у хутчэйшым часе яшчэ штоколечы. Дык вось 7 ліпня г. г. згулялі яшчэ адзін спэктакль. Паставілі: „Модны шляхцюк" і „Суд" таксама з дэклямацыяй вершаў. Артысты выканалі свае ролі вельмі добра так, што публіка была вельмі здаволеная.

Чэсьць Вам, маладыя артысты, за культурна-асьветную працу сярод свайго сярмяжнага бяздольнага люду!

× 12. VII—28 г. у м-ку Глыбокім, Акр. Упр. Т-ва Бел. Шк. адбылася другая вулічная квэста. Сабралі ўсяго 167 зл. 29 гр., якія пойдуць на культурна-асьветныя мэты Т-ва.

Акружная Упр. гэтым складае шчырую падзяку сяброўкам і сябрам за іхнія энэргічныя ходаньні, за іхнюю сьведамасьць і помач інтарэсам працоўных.

Карэспандэнцыі.

„Паляваньні" войта.

(Вайстамская гм., Вялейскага пав.).

23 траўня г. г. назначаны войтам Вайстамскае гміны асаднік і былы капітан Лявон Таллочка, будучы добра падпітым пасьля „баляваньня" з „сільнымі міра сего", вышаў на рынкавы пляц Вайстама і, як „osoba wojskowa", пачаў любімую гульню са стрэльбай, страляючы ў салю „Народнага Дому", з адлежнасьці прыблізна 100 шагоў, цэлячыся ў нейкі прадмет. У гэты момант прахадзіў 18-ці гадовы хлапец Трызна (сын уласьніка „Народнага Дому"), дык наш войт-капітан ледзь яго не забіў, куля катораму прайшла праз яго даўгія валасы. Хлапец спужаўся і паваліўся на зямлю. Матка гэтага хлапца, пабачыўшы гэтае здарэньне з сынам, думаючы, што ён забіты, абамлела. Але пан „капітан" не зважаў і далей вёў сваю „гульню", раніўшы другім стрэлам каня таго-ж Трызны.

Гэты-ж войт Таллочка, будучы таксама п'яным, нядаўна рабіў паляваньне на курэй, забіўшы іх аж чатыры штукі, даючы, як „odszkodowanie", потым па $1^1/_2$ зл. за курыцу.

Шмат нарабіў гэты наш войт ды такіх рэчаў, аб якіх брыдка пісаць. Вось напрыклад, пасьля той „забавы", дзе чуць не забіў хлапца, хацеў згвалціць двох дзяўчат.

Дык вось, якіх назначаюць нам войтаў! Якія-ж думкі стварающца ў чалавека, гледзячы на гэткія факты? Але... „сьцяўшы зубы" — маўчы.

Аб гэтым выпадку зложана скарга пракурору, а што будзе з яе, невядома.

Г.—Скок з-пад Вайстама.

Рада папраўляецца.

(Вялейшчына).

Дня 15 V 28 г. адбылося паседжаньне гм. Рады, якое было прысьвечана беларускім справам наагул.

Было ўхвалена: 1) — 300 зл. на інтэрнаты пры Беларускіх Гімназіях; 2) Вясьці пратаколы і іншыя справы, побач з мовай дзяржаўнай, і ў мове беларускай; 3) Гмінны будынак (быўшы магазын), каторы быў ухвалены шмат разоў на Народны Дом Т-ва Бел. Школы ў Вялейцы, але ў нядаўным часе была адмоўлена безапазыцыйна п. Ваяводам Рачкевічам, цяпер ізноў прынялі тую самую пастанову: гмінны будынак аддаць пад Народны Дом Т-ва Бел. Школы ў Вялейцы.

Усё гэта вышэй упамянутае пастанаўляла тая рада, што некалі дзялілася на правіцу і лявіцу. Але, як відаць, правіца пераканалася і падтрымала тыя прапановы, якія падавала лявіца.

Радныя іншых гмін павінны ўзяць прыклад з гміны Вялейскае. У. Н.

Што робіцца!

(М-ка Малеч, Пружанскага пав.).

Ня гледзячы на дэмагагічныя лёзунгі Паўлюкевічаў, Умястоўскіх, Ярэмічаў, „Сэадароў" і К-о, беларускі працоўны народ ідзе па свайму шляху. Змагацца за землю і палітычныя правы ён 100 тысячнай арміяй увалію у б. Грамаду, за школу-ж і культуру — у Т-ва Бел. Школы.

Лёс першай арганізацыі вядомы ўсяму сьвету. Пасаджаны за краты галоўныя павадыры, а да застаўшыхся на вёсцы тасуюцца рознага роду агранічэньні ў правох. Гэтак давалі тут у нас пазычку і калі сярод тых, што атрымлівалі яе, аказаўся адзін б. „грамадавец" — яму адмовілі і толькі, дзякуючы нашаму раднаму ў нав. Сойміку, яму ўдалося штосьці дастаць. Вось, што робяць!

Бом.

За асьвету.

(В. Вялікае-Сяло, Баранавіцкага пав.).

У сьнежні месяцы 1926 г. мы даведаліся, што можна дамагацца роднай школы. Зараз-жа запоўнілі дэкляраціі, войт пасьведчыў і 24-VIII даставілі Школьнаму Інспэктару ў м. Баранавічах.

Праз кароткі час прыяжджае ў нашу вёску сам Інспэктар і загадвае солтысу склікаць тых бацькоў, што падавалі дэкляраціі на беларускую школу. Калі-ж сабралося некалькі бацькоў, дык іх пачалі нагаварваць, каб адмовіліся ад белар. школы і згадзіліся на ўтраквістычную. Усе сталі цьвёрда пры сваіх жаданьнях. Навет 80-ці гадовы дзед, Д. Кот, сказаў: Як мы напісалі так і няхай застаецца г. зн., што мы хочам беларускае школы. Але яго сын Мік. Кот ды В. Равінскі — заступнік солтыса—адмовіліся ад свайго роднага. Ганьба ім!

З сьнежня мы арганізавалі гурток Т-ва Бел. Школы, які прыложыць усе свае стараньні, каб пашырыць асьвету сярод старых і малых, залажыўшы бібліятэку і ладзячы спэктаклі.

Дык да працы, сябры, за асьвету!

Голуб.

Палянізацыя папа.

(М-ка Любча).

У нашым мястэчку Любчы паны асаднікікі, поп ды нейкая „мадам" задумалі залажыць „культурна-асьветную" арганізацыю. На адкрыцьці быў сам Навагрaдзкі Староста, войт, якога ніхто ня выбіраў, але быў проста назначаны зьверху, ды іншыя паны.

У чэсьць гэтага „сьвята" поп Чарвінскі 8 ліпня адслужыў малебен, дзе з вялікаю гарачкай казаў, хоць перакручваючы на розны спосаб, казаньне папольску!

Палянізуйцеся, туды вам дарога!

Любчанелі.

Праца нашай вёскі.

(В. В.-Кракотка, Слонімскага пав.).

Гурток Т-ва Бел. Школы, які залажыўся досьць ужа даўно, вельмі шмат прычыніўся да прасьветы нашага пад'ярэмна-сялянскага жыцьця.

Пастаўлена ўжо шмат спэктакляў, аб якіх своечасна пісалася.

Залажылі бібліятэку-чытальню, для якой сьпярша адрамантавалі пустую, старую хату. Яна была не адпаведная для гэтага, бо была цёмная і сырая, але, калі матар'яльны стан бібліятэкі-чытальні папраўіўся, здабыліся на лепшы будынак. Сюды прыходзяць хлапцы, дзяўчаты, малышы і старыя чытаюць і слухаюць, як хто чытае.

Усё-ж у нашай вёсцы, хоць адзінкі, але ёсьць такія асобы, якія выракаюцца ўсяго роднага.

Пара было-б ім кінуць гэта і прылучыцца да другіх, каб разам працаваць для асьветы працоўных мас. Салавейка.

Адзін водку, другі сьлёзы.

(Горадзеншчына).

Сяляне з м-ка Скідэль занялі да хлява з сваіх сенажацяў штук каля дзесяці коней жыхароў в. Асошнікі і зажадалі выкупу па 10 зл. ад штукі. Ніякія ўгаварваньні, што гэта зроблена незнарок, першы раз, што больш гэтага ня будзе, не памагаюць. Кабеціна ўдава кідаецца ў ногі, просячы даравааць гэты раз: у хаце галодныя дзеці, зарабіць няма каму... Нічога не памагло: грошы былі зысканы. І пацякла вадой гарэліца, пачалося баляваньне датуль, пакуль ад 40 зл. астаўся адзін успамін.

Стыд і ганьба гэтакім людзём ад сваіх-жа бедных братоў! М. Знаёмы.

Пісьмо у Рэдкцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Ветліва прашу падаць пры помачы паважанай Вашай газэты да агульнага ведама Беларускага Грамадзянства, што я ў склад сяброў „Клюбу Беларускай Інтэлігенцыі" не ўходжу і нічога аб існаваньні гэтага Клюбу ня ведаю.

Чутка гэта была не адпавядаючай праўдзе, пададзенай віленскімі газэтамі „Kurjer Wileński" і „Утро", што ў апошняй і было мной спраставана.

З паважаньнем да Вас
Янка Маразовіч.

Вільня, 15/VII. 1928 г.

Паштовая скрынка.

Апомніўшамуся. Вашае пісьмо зьмесьцім у бліжэйшым нумары нашае газэты. Вітаем Ваш прыход з урадовай і здрадніцкай ППС.— **Горнаму.** Вашыя карэспандэнцыі атрымалі; будзем пакрысе зьмяшчаць. — **Абароніцу.** Пішыце чарнілам ды выразьней. З прысланага, калі разьбяромся, у чым справа, скарыстаем.—**Суседу Вую.** Вашая карэспандэнцыя ня мае шырэйшага грамадзкага значэньня — таму да друку не падыходзіць. — **Трабскаму, Зблудзіўшамуся, Грамадзяніну і Парахвіяніну.** Карэспандэнцыі атрымалі. Зьмесьцім у бліжэйшых нумарох. Пішыце больш.— **Прыслаўшым вершы.** Тыя вершы, якія да друку падыходзяць, будуць надрукаваны ў бліжэйшых нумарох; якія-ж слабыя і да друку не падыходзяць — дамо адказ, падзяліўшы іх на катэгорыі, якія ў іх недахопы. Кожнаму паасобку адказаць немагчыма, з прычыны вялікага напльву вершаў.

Рэдактар-Выдавец: Ал. Клаўсуць.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.